ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.16 (3232) ● ЧАЦВЕР, 28 КРАСАВІКА, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Душэўны голас званочка

На Вялікдзень скончыўся навучальны год у Нядзельнай школе, што пры Мінскім храме іконы Божай Маці Стар. 2

Светлыя фарбы “вечнага жывапісу”

Майстры з мінскага Свята-Елісавецінскага манастыра робяць адметныя мазаічныя кампазіцыі Стар. 3

Вернісажы ў Амстэрдаме

Галерэя, якую стварыла ў сталіцы Нідэрландаў Вікторыя Каваленчыкава, спецыялізуецца на сучасным беларускім мастацтве Стар. 4

РОДНЫ КРАЙ

Кірмаш карысных ідэй

У прычарнобыльскіх рэгіёнах жывуць і працуюць з улікам рэкамендацый навукоўцаў

Іван Іванаў

Неяк пад час камандзіроўкі ў Чачэрскі раён Гомельшчыны, які ў шэрагу іншых пацярпеў ад чарнобыльскай аварыі, я даведаўся: новыя сады пры некаторых школах, прыгожыя цяпліцы з’явіліся там дзякуючы падтрымцы еўрапейскага фонду “Супрацоўніцтва дзеля рэабілітацыі”. Школьнікі ахвотна расказвалі, што ўмеюць даглядаць фруктовыя дрэвы, вырошчваць “чыстую” гародніну. Вельмі карысныя праекты! Ці працягваюцца яны? “Папярэдні ўжо звершаны, рэалізуюцца два новыя ў прычарнобыльскіх рэгіёнах краіны, — удакладніла Вольга Лукашкова, кіраўнік праектаў ПРААН у Беларусі. — Асноўная іх мэта — павысіць узровень бяспекі жыхароў Брагінскага, Лунінецкага, Слаўгарадскага, Столінскага і Чачэрскага раёнаў. Працуем комплексна, з улікам усіх фактараў, якія можа ствараць павышаны радыяцыйны фон”. У ліку партнёраў яна назвала і вучоных з Інстытута радыялогіі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, які працуе ў Гомелі.

“Мы якраз будуем масток паміж радыяцыйнай навукай і практыкай, укараняем новыя распрацоўкі вучоных у рэальнае жыццё людзей прычарнобыльскіх рэгіёнаў, — расказвае Андрэй Маставенка, загадчык адной з лабараторый інстытута. — У прыватнасці, апрабоўваем і ўкараняем тэхналогіі, якія даюць магчымасць атрымліваць чыстую сельгаспрадукцыю. Бывае, наша інфармацыя ў гэтай справе, што называецца, на вагу золата, запатрабавана і сярод фермераў, і кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў. Прычым вучоныя ў справе рэабілітацыі тэрыторый, наладжванні бяспечнага жыцця для жыхароў працуюць сумесна як са структурамі ААН, так і з іншымі міжнароднымі арганізацыямі. Большасць праектаў скіраваны на аб’ектыўнае, своечасовае, комплекснае інфармаванне насельніцтва”.

У сярэдзіне красавіка, нагадаў А. Маставенка, у Слаўгарадзе ладзіўся першы Кірмаш здароўя. На яго навукоўцы прывезлі шмат наглядных матэрыялаў, літаратуры, папулярныя фільмы па выніках даследаванняў. Гэта быў своеасаблівы кірмаш карысных ідэй: вучоныя і спецыялісты давалі рэкамендацыі па харчаванні, вядзенні прыватных гаспадарак і сельгасвытворчасці, аздараўленні. “Мы нагадваем усім, што за 25 гадоў пасля Чарнобыля шмат змянілася, цяпер іншыя ўзроўні радыяцыі, — гаворыць А. Маставенка. — Раней, скажам, амаль уся сельгаспрадукцыя з прыватных гаспадарак у прычарнобыльскіх рэгіёнах мела павышанае ўтрыманне радыенуклідаў, а цяпер — практычна ўся чыстая. Асабліва ахвотна засвойваюць навыкі жыцця ў новых умовах школьнікі. Дзяржава ж накіроўвае вялікія сродкі на рэабілітацыю раней забруджаных тэрыторый. У нас пабольшала садоў, быў і сумесны беларуска-расійскі праект па іх закладцы. Бо яблыкі — цалкам чысты, безрадыяцыйны прадукт. Увогуле ж цяпер працаўнікі, выбіраючы месца жыхарства, звяртаюць увагу хутчэй не на крыху павышаны фон радыяцыі, а на добрую зарплату, камфортныя ўмовы жыцця. А ў самы бліжэйшы час з удзелам ПРААН у нашым інстытуце пачне працаваць інфацэнтр. Кожны жадаючы зможа па тэлефоне ці па інтэрнэце атрымаць кансультацыю ад вучоных, спецыялістаў па ўсіх пытаннях радыяцыйнай бяспекі”.

Старшакласнікі з вёскі Залессе Чачэрскага раёна ў новым кабінеце радыяцыйнай бяспекі

Крокі ў будучыню

Вольга Зуёнак

Напярэдадні 25-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС Нараўлянскі раён Гомельскай вобласці наведала дэлегацыя Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

Сёння лёгка ўбачыць, што сам райцэнтр Нароўля шмат будуецца, становіцца ўсё больш сучасным. “Але асабліва ўражвае тое, што ў людзей ёсць цікавасць да жыцця, імкненне ствараць сем'і, гадаваць дзяцей”, — заўважыў на сустрэчы з кіраўніцтвам раёна старшыня федэрацыі Леанід Козік.

Дарэчы, прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў ужо ў пяты раз наведваюць Нараўлянскі раён, над якім у 2006 годзе было ўзята шэфства. На працягу ўсіх гэтых гадоў прафсаюзная арганізацыя падтрымлівала раён і маральна, і матэрыяльна. Зараз старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Леанід Козік перадаў старшыні Нараўлянскага райвыканкама Валерыю Шлягу сертыфікат на суму ў 20 мільёнаў рублёў. Як адзначыў кіраўнік раёна, гэтыя грошы будуць накіраваны на патрэбы раённай медыцыны.

Пад час наведвання Нараўлянскага раёна дэлегацыя Федэрацыі прафсаюзаў пабывала ў аграгарадку Дзямідаў, дзе пазнаёмілася з працай сацыяльна-культурных аб'ектаў. Не засталіся без увагі і ветэраны раёна. Дарэчы, Федэрацыя прафсаюзаў яшчэ ў мінулым годзе абвясціла бестэрміновую маштабную рэспубліканскую акцыю “Адзінокім ветэранам — наш клопат”.

АСЯРОДДЗЕ

На ўлонні прыроды

Чаму ў Беларусі такая вялікая ўвага да захавання прыроднага асяроддзя? Пэўна, спрадвеку так павялося ў краі лясоў, азёр, рэк і балот. Асабліва захапляюць зялёныя скарбы прадстаўнікоў паўднёвых рэгіёнаў планеты, калі яны трапляюць да нас у госці: бывае, просяць спыніць экскурсійны аўтобус, каб палюбавацца на дубы, елкі, сосны, бярозы. Што ўжо казаць пра векавых волатаў з Белавежскай, Налібоцкай пушчаў… Дарэчы, краіна і цяпер уваходзіць у дзясятку вядучых лясных дзяржаў Еўропы: пад лясамі занята амаль сорак працэнтаў тэрыторыі Беларусі.

Іна Ганчаровіч

Пабываць у лесе, папрацаваць там на пасадцы дрэваў, калі ён ажывае, калі цвітуць пралескі, наталіць смагу празрыстым бярозавікам — невымоўная асалода. Мудрыя людзі кажуць: каб палюбіць, спазнаць лес, трэба часцей там бываць. І тады ўжо бачыш не толькі дрэвы, але і хмызнякі, дзіўныя травы і мхі, а таксама жучкоў і павучкоў, птушак і жывёл… Вялікі, непаўторны свет! І ў мове, ментальнасці беларусаў лёгка знайсці велізарны ўплыў тых законаў жыцця, па якіх уладкаваны складаныя лясныя біясістэмы. Гісторыкі перакананы, што раней лясы пакрывалі да 90 працэнтаў тэрыторыі, на якой мы жывём, а наўкол былі лугі, балоты, водныя гладзі. Пад напорам людзей лясы адступалі, на іх месцы з'яўляліся палеткі, пашы. Бывалі ў гісторыі чорныя часіны, калі замежныя захопнікі ці аматары хуткай нажывы па-варварску высякалі лясы. Прыкладам, значны ўрон быў нанесены ім у гады войнаў. Толькі ў Белавежскай пушчы за гады фашысцкай акупацыі было высечана і вывезена каля чатырох з паловай мільёнаў кубаметраў найкаштоўнейшай драўніны. → Стар. 2

Зялёныя парасткі будучага лесу

АСЯРОДДЗЕ

На ўлонні прыроды

Садзіць лес найлепш у вясновую пару

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Увогуле ж у гады перадваеннага будаўніцтва, а таксама Вялікай Айчыннай вайны беларускі лес панёс велізарныя страты: напрыканцы 1944-га за ўсю сваю гісторыю Беларусь аказалася найбольш "абязлесенай", лясы займалі менш як 20 працэнтаў тэрыторыі. І гэта пры тым, што беларусы заўсёды ставіліся да лесу як да вялікай святыні.

Сённяшнія лясныя багацці краіны — плён карпатлівай працы лесаводаў. Мы можам смела зваць Беларусь лясной дзяржавай. Мяркуйце самі: на кожную тысячу жыхароў у нас прыходзіцца прыкладна ў 1,7 раза лясоў больш, чым у Аўстрыі, у 3–4 разы больш, чым у Польшчы, Швейцарыі, Венгрыі, у 8–16 разоў больш, чым у Германіі, Італіі, Вялікабрытаніі ці Галандыі.

Цікава, якіх парод дрэваў у нашых лясах найболей? Сосны і елкі: пад імі ажно 60 працэнтаў плошчаў ляснога фонду Беларусі. Нямала і дубоў — 4 працэнты, а ясеняў каля 1 працэнта. Паўсюдна, у тым ліку і ў прыгарадных зонах, сустрэнеш бярозы, клёны, ліпы. Ёсць у нас і вельмі рэдкая піхта белая, адно з самых буйных вечназялёных еўрапейскіх дрэваў — дасягае ў вышыню да 60 метраў, жыве да 500 гадоў. Але расце прыгажуня ў Беларусі толькі ў Белавежскай пушчы, на адным з лясных астраўкоў сярод балотнага масіва. Паколькі бліжэйшыя піхтавыя лясы ёсць толькі ў Карпатах, то пакуль застаецца загадкай, як жа яна да нас трапіла.

Ну і, вядома ж, у кожнага лесу — свой характар, свая адметнасць. У адпаведнасці з экалагічным, эканамічным, а таксама сацыяльным значэннем іх падзяляюць на дзве групы. У першую трапляюць так званыя гаспадарчыя лясы, якія ў структуры ляснога фонду займаюць трохі больш за палову плошчаў. Гэта каштоўная крыніца драўніны, прадуктаў яе перапрацоўкі — такія лясы, вобразна кажучы, працуюць на наш дабрабыт. Дарэчы, усё лесакарыстанне ў краіне вядзецца па прынцыпе непарыўнасці і аднаўляльнасці прыродных рэсурсаў, і ў пітомніках Беларусі пастаянна гадуецца каля 300 мільёнаў сеянцаў і саджанцаў лясных парод — яны выкарыстоўваюцца пры лесаднаўленні.

З лесам цесна спалучана і духоўнае жыццё нашага грамадства, здароўе людзей. Таму другую групу ўтвараюць лясы, што працуюць на экалогію, аздараўленне. Найбольш важныя тут запаведнікі і нацыянальныя паркі, гэтыя тэрыторыі знаходзяцца пад асаблівай аховай, займаюць каля васьмі працэнтаў тэрыторыі краіны. Цяпер, як вядома, у Беларусі ёсць адзіны запаведнік — Бярэзінскі біясферны, чатыры нацыянальныя паркі — Белавежская пушча, Браслаўскія азёры, Нарачанскі і Прыпяцкі. Ёсць яшчэ 84 заказнікі ўсебеларускага значэння. Там, на ўлонні прыроды, штогод адпачываюць, набіраюцца сілы і жыццёвых ведаў тысячы людзей.

Дарэчы, менавіта ў красавіку праходзіла ўсебеларуская добраахвотная акцыя "Тыдзень лесу-2011", прысвечаная Міжнароднаму году лясоў. Прымалі ўдзел у акцыі, ініцыяванай Міністэрствам лясной гаспадаркі, усе, хто пажадаў. У лясгасах былі выдзелены плошчы, на якіх добраахвотнікі высадзілі тысячы дрэў, яны дапамаглі прыбіраць тэрыторыі, закладвалі алеі і нават цэлыя дэндрапаркі. Лясгасы забяспечылі працоўныя дэсанты пасадачным матэрыялам і прыладамі працы, наладжвалі экскурсіі ў пітомнікі і паляўнічыя сядзібы. Пад час акцыі "Тыдзень лесу" на выставах-кірмашах лясных гаспадарак у шэрагу раёнаў прадавалася экалагічна чыстая прадукцыя. Прайшло шмат сустрэч лесаводаў са школьнікамі, моладдзю. Важна, лічаць спецыялісты, у Міжнародны год лясоў усім нагадаць: ад таго, як мы ставімся да лясных рэсурсаў, у немалой ступені залежыць эканамічная, экалагічная і харчовая бяспека краіны.

Яскравыя сведкі былой цеплыні

Алеся Яцковіч

На выставе "Беларусь: 25 гадоў пасля Чарнобыля" ў Нацыянальным гістарычным музеі прадстаўлены незвычайныя экспанаты

Пасля чарнобыльскай аварыі масава адсяляліся жыхары дзясяткаў беларускіх вёсак. Менавіта з тых месцаў і трапілі ў Нацыянальны гістарычны музей многія экспанаты, якія цяпер можна пабачыць на выставе. Але спачатку наведвальнікі бачаць кампазіцыю фотаматэрыялаў са звесткамі пра наступствы чарнобыльскай катастрофы для Беларусі. Тут можна даведацца аб тым, як дзяржава клапоціцца пра людзей, што жывуць у найбольш пацярпелых раёнах, шмат матэрыялаў пра міжнароднае супрацоўніцтва. Цікава адлюстравана і цяперашняе жыццё ў тых рэгіёнах Гомельскай, Магілёўскай, Брэсцкай абласцей, якія закранула крыло чарнобыльскай бяды.

Экспанаты з пакінутых вёсак

Адметнасць гэтай выставы ў тым, што на ёй прадстаўлены прадметы культурнай спадчыны з пацярпелых тэрыторый. Іх збіралі ў 90-х гадах з рызыкай для жыцця вучоныя, даследчыкі — навуковыя экспедыцыі працавалі ў раёнах адсялення. Дэманструюцца на выставе і працы вядомых мастакоў, можна пагартаць выданні чарнобыльскай тэматыкі, у тым ліку фотаальбомы пра адраджэнне жыцця ў пацярпелых раёнах. У выставачнай зале праходзяць паказы тэматычных кінастужак, у тым ліку новага фільма "Урокі Чарнобыля".

Душэўны голас званочка

Менавіта на Вялікдзень скончыўся навучальны год у Нядзельнай школе, што пры Мінскім храме іконы Божай Маці. Але яшчэ на працягу некалькіх тыдняў вучні будуць ладзіць канцэрты і тэатральныя дзеі, праводзіць ранішнікі.

Кацярына Мядзведская

Трэба сказаць, што школа гэтая незвычайная. Тут не ставяць адзнак, урокі доўжацца па трыццаць пяць хвілін, а аб пачатку заняткаў абвяшчае звычайны званочак. А звініць у яго, дарэчы, заўсёды старэйшая дачка дырэктара нядзельнай школы Яраслава Блізнюка. Урокі духоўнасці, безумоўна, лішнімі не бываюць. Тым больш, як гаворыць айцец Яраслаў, прыйсці ў школу можна ў любым узросце.

У гэтай школе ўжо на працягу дваццаці гадоў збіраюцца поўныя класы. Сёння тут вучацца больш за 400 чалавек. На творчых уроках дзеці малююць, лепяць, ствараюць святочныя паштоўкі для бацькоў на біблейскія тэмы. Асобныя заняткі прысвечаны музыцы і спевам. Вучаць спяваць усіх, нават дарослых. А самыя "галасістыя" ўдзельнічаюць у школьным хоры, які, дарэчы, часта прадстаўляе сваё майстэрства на конкурсах і фестывалях у розных краінах.

Перад Пакровамі, Калядамі, Вялікаднем дзеці рыхтуюць канцэрты, робяць тэатральныя пастаноўкі. Заўсёды чакаюць гэтыя святы, хвалююцца: на іх жа прыходзяць паглядзець бацькі, аднакласнікі са звычайных школ, сябры. "Перад намі стаіць задача не столькі даць веды, колькі зацікавіць, — гаворыць Яраслаў Блізнюк, — Мы павінны растлумачыць духоўны свет, зрабіць зразумелай веру".

Веды са старажытных кніг — сучасныя

Пра жыццё святых цікава расказваюць выпускнікі Мінскай духоўнай семінарыі, тэалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сярод выкладчыкаў — і мастачка Любоў Грамыка. Яна пісала партрэты патрыярхаў праваслаўнай царквы, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, святых пакутнікаў. З заснавання школы выкладае і іконапісец Вольга Чарняк.

А вось дзякуючы настаўніцы малодшых класаў Валянціне Паўлавай на працягу дзесяці гадоў ладзяцца паломніцкія экскурсіі. Вучні ўжо шмат дзе пабывалі: зімой штогод праходзяць хрысціянскія маладзёжныя сустрэчы ў розных гарадах Еўропы, а летам працуе выязны лагер. "Сёлета мы наведвалі Галандыю, раней былі ў Бельгіі, Італіі, Швейцарыі, Партугаліі. Валянціна Мікалаеўна заўсёды сачыла за тым, каб разам з адпачынкам ладзіліся цікавыя экскурсіі па святых мясцінах".

А ў планах самой нядзельнай школы — пошук новых цікавых формаў навучання. "Каб той, хто прыйшоў да нас, — гаворыць айцец Яраслаў, — змог вынесці думкі, якія б дапамаглі яму ў жыцці".

Дарэчы

Больш за 70 рознапланавых спецпраектаў будзе рэалізавана паводле пятай дзяржаўнай чарнобыльскай праграмы да 2015 года. На іх плануецца выдаткаваць каля 7 трыльёнаў беларускіх рублёў. Пры гэтым прыярытэтныя напрамкі — сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых ад аварыі тэрыторый, развіццё і стварэнне новых вытворчасцяў, што ў сукупнасці значна павысіць якасць жыцця мясцовага насельніцтва. На папярэднія чатыры праграмы выдаткавана звыш 15 мільярдаў долараў, гэта амаль два гадавыя дзяржбюджэты.

СТАН ДУШЫ

Светлыя фарбы “вечнага жывапісу”

Майстры з мінскага Свята-Елісавецінскага манастыра робяць адметныя мазаічныя кампазіцыі для праваслаўных храмаў Беларусі, Расіі, Украіны

Мастак Максім Дудараў — майстар мазаічных спраў

Іван Ждановіч

Мазаічнае аздабленне храмавых сцен, купалоў — вельмі працаёмкі, а таму і даволі рэдкі ў наш час від мастацтва. Як мне расказалі самі мастакі, вядомы ён здаўна: яшчэ ў старажытным Канстанцінопалі, цяперашнім Стамбуле, хрысціянскія храмы ўпрыгожваліся мазаікамі, і некаторыя выявы збераглися там з XII стагоддзя. Ёсць мазаікі і ў беларускіх храмах. Такое мастацтва нездарма называюць “вечным жывапісам”, мазаікі доўгія гады не губляюць колеру, і яны вельмі прыгожыя.

У тым лёгка пераканацца ў манастырскім Храме ў гонар Іконы Божай Маці Дзяржаўнай. На сценах, у аздабленні ўнутранай паверхні вялікага купала важнае месца займаюць мазаікі, зробленыя мясцовымі майстрамі. Пры храме створана сценапісная майстэрня, у якой з часам утварыўся і асобны мазаічны цэх. А працуюць мазаічнікі, якіх ужо каля дваццаці, тут жа, на цокальным паверсе храма, кіруе імі паслушнік Дзмітрый Кунцэвіч.

У большасці майстроў ёсць вышэйшая мастацкая адукацыя, іншыя прайшлі праз мастацкія школы і вучылішчы. Эскізы будучых выяў тут робяць на камп’ютарах, шырока выкарыстоўваецца вопыт папярэднікаў з розных краін, дзе ў храмах захаваліся адметныя мазаічныя абразы, кампазіцыі.

Як і раней, асноўным матэрыялам для сучасных храмавых мазаік служаць невялічкія кавалачкі каляровага шкла, ці смальты. Шэраг фрагментаў будучых кампазіцый ствараецца прама ў майстэрні па эскізах, зробленых мастакамі і ўзгодненых з заказчыкамі. Такая праца, вядома ж, патрабуе ад кожнага з майстроў не толькі цярплівасці, але і добрага мастацкага густу. Бывае, дробныя дэталі мазаік даводзяцца і на рыштаваннях, для экстэр’ера храмаў часцей робяцца гатовыя пано-іконы.

Цікавы заказ выконваюць цяпер беларускія майстры ў Цярнопальскай вобласці Украіны, у Пачаеўскім Троіцкім саборы. На яго фасадзе ёсць мазаічнае пано, зробленае па эскізах вядомага мастака Мікалая Рэрыха. І менавіта майстрам з Мінска даверылі правесці яго рэстаўрацыю, умацаваць і замяніць некаторыя дэталі. Мазаічнікі ўжо працавалі ў Пачаеўскай Лаўры ў Оптынай Пустыні, што пад расійскай Калугай, у храмах Масквы. І ў саборы Аляксандра Неўскага ва ўкраінскім горадзе Камянец-Падольскі, што ў Хмяльніцкай вобласці, на заказ мінскія майстры ўжо зрабілі вялікую мазаіку пад купалам і ікону ў алтарнай частцы. У праектах — Рым, Белград.

Удзельнічаюць яны і ў аздабленні беларускіх храмаў. Часта майстроў знаходзяць па інфармацыі на манастырскім сайце. А працуюць яны абавязкова з добрым настроем і малітвай — тады, гавораць, і справа ладзіцца, і менш стамляешся, і ўсё задуманае атрымліваецца.

Змястоўная скарбонка багатай спадчыны

Кацярына Сідзелава

Унікальная энцыклапедыя “Максім Багдановіч”, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння беларускага класіка, пабачыць свет у верасні

Гэты творчы калектыў стварае новую энцыклапедыю

Персанальная энцыклапедыя на беларускай мове, якая ўключыць у сябе асноўныя моманты жыцця і творчасці літаратара, стане трэцім падобным выданнем у гісторыі Беларусі. Кніга падвядзе своеасаблівую рысу ў даследаваннях пра беларускага класіка. “Наша задача — скласці назапашаныя веды і зафіксаваць іх, — расказвае дырэктар выдавецтва “Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі” Таццяна Бялова. — Выданне заклікана раскрыць некаторыя белыя плямы ў жыцці і творчасці Максіма Багдановіча. Мы павінны абудзіць нацыянальную самасвядомасць беларусаў, каб паказаць, які мы яркі і таленавіты народ. Бо Максім Багдановіч — гэта жамчужына беларускай літаратуры”.

На старонках выдання плануецца размясціць больш за 2000 матэрыялаў. Сярод іх артыкулы пра мастацкія і публіцыстычныя творы знакамітага паэта і празаіка, аналіз выяўленчых сродкаў і саміх матэрыялаў Максіма Багдановіча. Тут таксама з’явіцца інфармацыя пра першыя публікацыі класіка і іх пераклады на іншыя мовы. Частка артыкулаў энцыклапедыі будзе прысвечана сувязі выдатнага беларуса з замежнай літаратурай і мастацтвам. Акрамя таго, у выданні будуць асветлены творы мастацтва, якія з’явіліся пад уплывам творчасці Максіма Багдановіча. Таксама плануецца, што энцыклапедыя будзе ўпрыгожана яркімі ўнікальнымі ілюстрацыямі.

Па словах аднаго са складальнікаў выдання Мікалая Труса, сёння трэцяя частка матэрыялаў ужо напісана. “Персанальная энцыклапедыя — гэта вышэйшы пілатаж у кнігавыдавецтве, таму што ўсе публікацыі ўнікальныя і арыгінальныя. Гэта вельмі складаная і працаёмкая работа: правяраюцца даты і звесткі, ідзе праца ў архівах”, — растлумачыў ён.

Ідэя выдання энцыклапедыі з’явілася яшчэ ў 80-х гадах XX стагоддзя пад час святкавання 100-гадовага юбілею з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Над стварэннем кнігі працуюць вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, пісьменнікі, крытыкі, супрацоўнікі музеяў і архіваў, бібліёграфы і іншыя спецыялісты.

Нястомны даследчык

Лявон Целеш

Кніга “Мікола Ермаловіч” выйшла да 90-х угодкаў вядомага гісторыка і была прэзентавана на яго малой радзіме ў Дзяржынскім раёне

Мікола Іванавіч Ермаловіч вядомы найперш як аўтар навуковай канцэпцыі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Аўтарытэтны гісторык, літаратар нарадзіўся 90 гадоў таму ў вёсцы Малыя Навасёлкі Дзяржынскага (раней Койданаўскага) раёна. На яго малой радзіме, у сярэдняй школе суседняй вёскі Вялікія Навасёлкі, і прайшла прэзентацыя кнігі “Мікола Ермаловіч”. Выдадзены ў серыі “Беларускі кнігазабор” том — гэта і помнік нястомнаму даследчыку даўніны, і падручнік для сучаснікаў. Кніга выйшла з прадмовай гісторыка Анатоля Грыцкевіча. Амаль палову яе займае праца М. Ермаловіча “Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае”. Змешчаны і гутаркі, крытыка, лісты М. Ермаловіча, што раней не друкаваліся.

У актавай зале, дзе сабраліся настаўнікі, вучні школы, жыхары вёскі, гаварылася пра няпросты жыццёвы і творчы шлях М. Ермаловіча, гучалі вершы юбіляра. Журналіст і гісторык Анатоль Валахановіч расказаў пра свае стасункі з яго старэйшым сябрам. У гутарцы ўдзельнічалі дырэктар школы Святлана Ганчар, загадчык школьнага краязнаўчага музея Вячаслаў Кавалеўскі, дырэктар Дзяржынскай раённай бібліятэкі Валянціна Клімовіч, археолаг і бард Пятро Русаў.

А праз два тыдні прэзентацыя кнігі прайшла і ў Дзяржынску, у Цэнтральнай раённай бібліятэцы. На сустрэчу з чытачамі прыехалі галоўны рэдактар “Беларускага кнігазабору”, укладальнік і аўтар каментарыяў кнігі “Мікола Ермаловіч”, пісьменнік Кастусь Цвірка, паэт Міхась Скобла, гісторыкі Леанід Акаловіч, Анатоль Валахановіч і Пятро Русаў. Усе яны добра ведалі Міколу Ермаловіча пры жыцці, таму іхнія ўспаміны ўспрымаліся з вялікай увагай. Выступоўцы адзначылі, што Мікола Ермаловіч, не меўшы ні вучоных ступеняў, ні званняў у знакавых

Мікола Ермаловіч

кнігах “Па слядаў аднаго міфа”, “Старажытная Беларусь” упершыню грунтоўна даказаў, што Вялікае Княства Літоўскае было магутнай беларускай дзяржавай: са сваім адметным пісьменствам, з высокай культурай. Прычым гэта была дзяржава, якую паважалі, з якой лічыліся і ўсходнія, і заходнія суседзі.

З НАГОДЫ

Вернісажы ў Амстэрдаме

Галерэя, якую стварыла ў сталіцы Нідэрландаў Вікторыя Каваленчыкава, прадстаўляе сучаснае беларускае мастацтва

Іван Ждановіч

З мінулага года ў рэдакцыйнай пошце з'яўляюцца інфармацыйныя бюлетэні, запрашэнні на вернісажы ад мастачкі Вікторыі Каваленчыкавай. Выбрацца на іх пакуль не ўдалося... Але і невялічкага падарожжа па інтэрнэт-прасторы хапіла, каб удакладніць: выпускніца Беларускай акадэміі мастацтваў гады тры таму адкрыла ў Амстэрдаме мастацкую галерэю. І адметныя карціны, якія Вікторыя стварае без мальберта, прама на падлозе ў майстэрні, ужо заўважаны мастацтвазнаўцамі на дзясятках экспазіцый у розных краінах. А на зробленым з вялікім густам сайце можна пабачыць шэраг цікавых анонсаў выстаў з удзелам Вікторыі. Уражвае, скажам, персанальная выстава "Замкнёны контур" у Бельгіі, у старадаўнім замку Брасшата. Выстаўляецца Каваленчыкава як асобна, так і з іншымі майстрамі ў Гаазе, Лондане (там і цяпер ёсць яе выстава "Адлюстраваная рэальнасць"), Парыжы, Нью-Ёрку, пададзены фотарэпартажы з тых вернісажаў. У свой час і Ян Петэр Балкенендэ, калі быў прэм'ер-міністрам Нідэрландаў, з цікавасцю разглядаў яе творы, распытваў пра Беларусь, пра наша сучаснае мастацтва.

На ліст з прапановай больш паведаміць пра сябе Вікторыя Каваленчыкава сціпла адказала, што, маўляў, будзе хутка нагода: сёлета плануецца выстава і ў Мінску. І ўжо запрасіла на будучы вернісаж у Мастацкі музей.

У мастачкі Вікторыі Каваленчыкавай шмат творчых задум

А пакуль зямлячка паведамляе пра беларускія мастацкія навіны з Амстэрдама. Прыкладам, у красавіку VK Gallery ладзіла беларускі стэнд на вялікім кірмашы твораў мастацтва і антыкварыяту ў галандскім горадзе Хертогенбош. Вікторыя нагадала, што яе галерэя спецыялізуецца на беларускім сучасным мастацтве, і назвала тых, каго яна прэзентавала. А гэта маладыя мастакі, скульптары, графікі з Беларусі: Віктар Мінко, Ксенія і Аляксандр Шапо, Андрэй Верабей, Мікалай Дробыш, Аляксандр Шомаў.

...І маршруты для імяніннікаў

Мінская дзіцячая чыгунка пачынае новы сезон

Вольга Бяляўская

Па маршрутах дзіцячай чыгункі пачалі курсіраваць два цягнікі з шасці вагончыкаў кожны. Кірункі засталіся ранейшымі — ад станцыі "Заслонава" праз "Піянерскую" да "Сасновага Бору" і назад. Сёлета на дзіцячай чыгунцы можна таксама замовіць святочныя маршруты для маленькіх імяніннікаў з музычным суправаджэннем, казачнымі персанажамі і цацкамі.

Працаваць на дзіцячай чыгунцы будуць юныя чыгуначнікі. Яны будуць выконваць абавязкі машыністаў, начальнікаў цягніка, станцыі і дзяжурных па ёй, дыспетчараў. Навучанне малыя чыгуначнікі праходзяць у спецыяльным цэнтры ў Мінску. Тут школьнікі знаёмяцца з работай транспарту, вывучаюць прылады і канструкцыі лакаматываў і вагонаў, чыгуначнага шляху, сродкаў сігналізацыі і сувязі. Падарожжы па дзіцячай чыгунцы для іх — гэта не толькі займальныя паездкі, але і далучэнне да працы на чыгуначнай магістралі.

Юным пасажырам цікава на Дзіцячай чыгунцы

У маі дзіцячая чыгунка будзе працаваць па выхадных і святочных днях, а летам — і па буднях.

Першы цягнік, дарэчы, па Мінскай дзіцячай чыгунцы прайшоў 9 ліпеня 1955 года. Цікава, што дзіцячая магістраль адрозніваецца ад вялікай толькі шырынёй каляіны, а ва ўсім астатнім яна ў мініяцюры паўтарае ўсё, што ўласціва Беларускай чыгунцы. Працягласць трасы ў яе — амаль пяць кіламетраў.

Калі здараюцца цуды

Каля сотні твораў юных аўтараў сабралі на незвычайнай выставе ў галерэі "Лабірынт" яе арганізатары з Нацыянальнай бібліятэкі і Міжнароднай гільдыі жывапісцаў

У дзяцей з парушэннем слыху са студыі "Палітра", псіханеўралагічнага інтэрната, — свой погляд на свет. Так сталася, што чуллівыя душы гэтых мастакоў абмежаваны ў магчымасцях па нейкіх фізічных ці псіхічных прычынах. Дабрачынная мастацкая выстава "Свет за вакном" якраз і створана, каб сцвердзіць: творчасць дапамагае пераадольваць любыя межы. Толькі варта падтрымаць тых, хто мае патрэбу, і мы пабачым сапраўдны цуд жыцця. Бо ці ж не цуд, калі квітнеюць гэтыя сціплыя кветкі, калі ззяе душа ў памкненні да прыгажосці… Асаблівая ўвага на выставе да твораў Алены Нікалаенкі з Буда-Кашалёўскага раёна Гомельшчыны і Надзеі Сакалоўскай з Зэльвы, што на Гродзеншчыне. Абедзве яны на вернісажы самі прадстаўлялі свае цудоўныя вышыўкі. Дарэчы, каб іх паездка ў Мінск адбылася, парупіліся мясцовыя ўлады.

Па вадзе — з камфортам

Вольга Кабяк

Пінскі суднабудаўнічы завод атрымаў заказ на будаўніцтва плывучага гатэля ад гомельскай турыстычнай кампаніі

Па словах дырэктара завода Віктара Бруцкага, будаваць такія судны даводзіцца не ўпершыню, раней са стапеляў завода сышлі тры турыстычныя цеплаходы. Адзін з іх курсіруе па Аўгустоўскім канале ў Гродзенскай вобласці, другі — на Выганашчанскім возеры ў Брэсцкай, трэці — у Віцебскай вобласці.

Цяперашні заказ па-свойму ўнікальны: упершыню пінскія суднабудаўнікі ствараюць плывучы гатэль. Прычым гэта будзе не самаходнае судна, а плывучая платформа з палубнай надбудовай. Да месца прызначэння плывучы гатэль будзе перамяшчаць буксір.

Пра тое, што гэта ўсё ж такі рачное судна, засведчаць бакавыя ілюмінатары, ды і замест пакояў будуць каюты. Іх, дарэчы, ствараюць па аналогіі з тымі, што на цеплаходах.

Бег — гэта жыццё

Міждзяржаўны лёгкаатлетычны прабег "Званы Чарнобыля", прымеркаваны да 25-й гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, прайшоў у Хойніках

Як вядома, Хойнікі — адзін з трох блізкіх да Чарнобыля райцэнтраў Гомельшчыны — у свой час найбольш пацярпеў ад аварыі. І вось — лёгкаатлетычны прабег як сведчанне таго, што галоўныя хваляванні ў мінулым. У прабегу ўдзельнічала амаль паўтары тысячы чалавек, у тым ліку прадстаўнікі замежных дыпмісій, акрэдытаваных у Беларусі, Гомельскага аблвыканкама, многіх грамадскіх арганізацый. І, вядома ж, жыхары Гомельшчыны.

Кожны выбіраў дыстанцыю па сілах: самыя юныя змагаліся на 60-метроўцы, школьнікі беглі адзін-два кіламетры, а іншыя спаборнічалі на пяці, дзесяці, і нават дваццацікіламетровай дыстанцыі. Пераможцы адзначаны дыпломамі і падарункамі.

Сам прабег запомніцца ўскладаннем кветак да помніка Смутку ў Хойніках. Акрамя таго, удзельнікі прабегу наведалі выставу выяўленчага мастацтва і фотаэкспазіцыю, прысвечаную чарнобыльскай трагедыі.

Незвычайны вобраз

Дзіяна Курыла

Напярэдадні Вялікадня ў фальклорна-міфалагічным комплексе "Азяркі", што ў Пастаўскім раёне, з'явіўся помнік яйку

Шкарлупку пастаўскага яйка на Вялікдзень разбіць не атрымалася — яна выраблена з бетону. Помнік стаіць на пастаменце і ўзвышаецца на два метры. Размалёўка на ім сімвалічная, створаная якраз да хрысціянскага свята.

Яйка стала каларытнай асаблівасцю новага турыстычнага маршруту, што распрацаваны Пастаўскім цэнтрам турыстычных паслуг. Дарэчы, гэты тураператар ужо паспеў стаць знакамітым дзякуючы адраджэнню беларускага фальклорнага персанажа Зюзі — "калегі" Дзеда Мароза.

"Пад час правядзення праграмы "Велікодныя традыцыі Пастаўскага Паазер'я" таксама не абыходзіцца без тэатральных прадстаўленняў, — гаворыць дырэктар турыстычнага цэнтра Ягор Шушкевіч. — Мы хочам паказаць гасцям, як святкавалі Уваскрасенне Хрыстова продкі, а помнік яйку пры гэтым будзе задзейнічаны ў пастаноўках".

Дарэчы, раней у Беларусі помнікаў яйку не было. А вось у некалькіх гарадах Расіі ўсталяваны такія арыгінальныя пастаменты. Ёсць яйкавыя фігуры ва Украіне і ў Канадзе.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1960
Заказ: 511
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2011